**Знаходкі.** Кніжны скарб, які нядаўна быў знойдзены ў старажытным Брыгіцкім кляштары ў Гродне, прэзентавалі ўчора ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Наведвальнікі змаглі ўбачыць незвычайную знаходку — фрагмент архіва старажытнай друкарні — неразрэзаныя і незбрашураваныя лісты кніг XVII і XVIII стагоддзяў, падрыхтаваныя для пераплётных работ. «На кожным з друкарскіх лістоў размяшчаецца па восем старонак тэксту, якія ў далейшым павінны былі адпаведным чынам складвацца ў сшыткі, перашывацца разам, абразацца і пераплятацца ў прывычную нам сёння форму кнігі-кодэкса», — распавядаюць арганізатары. Па невядомых прычынах частка тыражу двух выданняў засталася ў стосах з асобных лістоў, якія на працягу некалькіх стагоддзяў захоўваліся ў кляштары. Са згоды царкоўных улад гэты скарб будзе перададзены ў галоўную кніжніцу краіны.